За правы чалавека

Віцебскі рэгіянальны праваабарончы бюлетэнь

№ 8 (67) Ліпень 2012 г.

Прысуд Яўгену Гуцалаву - штраф у памеры 2 400 000 рублёў

4 ліпеня ў Віцебску судзілі маладафронтаўца Яўгена Гуцалава. Судзьдзя Іна Грабоўская прызнала актывіста вінаватым у правапарушэньнях, прадугледжаных артыкуламі 17.1 і 23.4 КаАП. За брыдкаслоўе Яўгену Гуцалаву прызначылі штраф у памеры 3 базавых велічынь. За тое, што падчас затрыманьня ён нібыта не падпарадкаваўся патрабаваньням супрацоўнікаў аховы правапарадку, яго пакаралі штрафам у 21 базавую велічыню. Такім чынам, агульная сума, якую сябра "Маладога Фронту" павінен сплаціць у бюджэт дзяржавы, складае 24 "мінімалкі" - 2,4 мільёна рублёў.

Каб падтрымаць Яўгена, яго паплечнікі, грамадзянскія актывісты і праваабаронцы прыйшлі ў Кастрычніцкі райсуд на раніцы. Аднак даведацца пра час пачатку судовага паседжаньня ім не ўдалося. Толькі калі суд ужо распачаўся, выпадкова высьветлілася, што Яўген Гуцалаў быў дастаўлены з ізалятару часовага ўтрыманьня, дзе правёў ноч, у будынак суду загадзя, і што судзьдзя Іна Грабоўская вырашыла праводзіць судовы разбор у сваім габінэце. У выніку ніхто з тых, хто хацеў прысутнічаць на працэсе, на паседжаньне дапушчаны ня быў.



Яўген Гуцалаў быў затрыманы напярэдадні, падчас распаўсюду ім улётак у падтрымку байкоту парлямэнцкіх выбараў у межах кампаніі *"Ігнор-2012"*. Затрымлівалі маладафронтаўца не звычайныя міліцыянты, а супрацоўнікі АМАПу, якія потым выступалі ў судзе ў якасьці сьведак. Пасьля затрыманьня быў праведзены асабісты надгляд рэчаў актывіста. У ягоным заплечніку былі знойдзеныя ўлёткі і нацыянальны сьцяг, аднак канфіскоўваць іх ня сталі.

Рашэньне, вынесенае судзьдзёй Грабоўскай, Яўген Гуцалаў лічыць несправядлівым ды палітычна матываваным і зьбіраецца абскардзіць яго ў абласным судзе. Дарэчы, затрыманьне і суд - гэта ня першы выпадак перасьледу актывіста за яго палітычныя перакананьні: некалькі дзён таму начальства "Белтэлекаму", дзе ён працуе, паведаміла маладафронтаўцу пра яго звальненьне...


У Багушэўскім сухотным шпіталі чарговая галадоўка



"Мэтады лекаваньня патрабуюць найхутчэйшага рэфармаваньня па ўсёй тэрыторыі таталітарнай дзяржавы. З мэтай хаваньня фактаў незадаволенасьці пацыентаў адміністрацыя працягвае ціснуць на хворых. Я вымушаны абвясьціць з 17 ліпеня галадоўку з адмовай ад прыёму ўсіх лекаў. З павагай да ўсіх неабыякавых інвалід другой групы ***Такаровіч Мікалай Сямёнавіч****"*, - адзначыў у сваёй заяве пацыент Багушэўскага абласнога сухотнага шпіталя (Віцебская вобласьць).

У шпіталі зноў узмацніўся ціск на хворых, якія выказваюць сваю нязгоду з мэтадамі лекаваньня. *"Пры гэтым носьбіты бактэрыялягічнай зброі, якія сутыкаюцца з надзвычайным прэсынгам, могуць абараняцца толькі праз палачку Коха і галадоўку, якая для хворых на сухоты супрацьпаказаная, бо іх лекаваньне наўпрост залежыць ад належнага харчаваньня"*, - адзначаюць яны. Паводле слоў пацыентаў, згодна са статыстыкай, харчаваньне хворых знаходзіцца ў адпаведнасьці з нормамі міністэрства аховы здароўя, але насамрэч не адрозьніваюцца ад пайкі для асуджаных у турмах. Таксама хворыя выступаюць супраць "новых" мэтадаў лекаваньня, якія ўжывае адміністрацыя шпіталя і якія зьяўляюцца састарэлымі ў сусьветнай практыцы, а ў краінах Эўрапейскага зьвязу не выкарыстоўваюцца ўжо 40 гадоў.

Барыса Хамайду затрымалі. Ён паабяцаў, што ня будзе распаўсюджваць прэсу ў дзень прыезду Лукашэнкі



Віцебскага распаўсюдніка незалежнай прэсы **Барыса Хамайду** затрымалі апоўдні 11 ліпеня ў цэнтры гораду, каля так званага Сіняга дому, напярэдадні адкрыцьця "Славянскага базару". Затрымліваць апазыцыянэра прыехалі высокія міліцэйскія чыны. Барыс Хамайда расказвае: *"Прыехаў кіраўнік Чыгуначнага РАУС і яго намесьнік, завезьлі мяне ў РАУС. Там я знаходзіўся каля гадзіны. Яны патрабавалі, каб я не прыходзіў да свайго месца. Але я ім сказаў, што заўтра, калі Лукашэнка прыяжджае, я не прыйду, таму што не жадаю яго бачыць. А ў пятніцу, як звычайна, прыйду да Сіняга дому"*.

Мінулыя гады на пачатку фэстывалю "Славянскі базар" Барыса Хамайду затрымлівалі і давалі "суткі" за несанкцыянаванае пікетаваньне. Сёлета абыйшлося без зьмяшчэньня за краты. Адкрыцьцё сёлетняга фэстывалю з удзелам **Аляксандра Лукашэнкі** адбылося 12 ліпеня.

У Віцебску забаранілі акцыю салідарнасьці з Алесем Бяляцкім

Пікет салідарнасьці з палітвязьнем *Алесем Бяляцкім* павінен быў адбыцца 4 жніўня, у дзень, калі споўніцца год з моманту арышту кіраўніка праваабарончага цэнтру "Вясна". Аднак улады не дазволілі правядзеньне акцыі. Сваё рашэньне пра забарону імпрэзы намесьнік кіраўніка адміністрацыі Кастрычніцкага раёну Віцебску *Віктар Галанаў* абгрунтаваў тым, што заяўнікі не заключылі дамоваў на абслугоўваньне мерапрыемства з аддзелам унутраных спраў, гарадзкой цэнтральнай паліклінікай і прадпрыемствам "Віцебская жыльлёва-камунальная гаспадарка".



Патрабаваньне заключаць дамовы з камунальнікамі, мэдыкамі і міліцыянтамі для атрыманьня дазволу на масавыя мерапрыемствы, якія арганізуюцца без удзелу ворганаў улады, зьявілася ў 2009 годзе, калі Віцебскі гарвыканкам прыняў сумнавядомае рашэньне № 881 "Аб масавых мерапрыемствах у горадзе Віцебску". З дня прыняцьця гэтага рашэньня мясцовыя ўлады не далі дазволу ні на адну акцыю, якая ім не да спадобы.

Масавыя мерапрыемствы ў Віцебску, якія хочуць зладзіць актывісты грамадзянскай супольнасьці, апазыцыйныя палітыкі, праваабаронцы, пастаянна забараняюцца. Забараняюцца быццам бы на законнай падставе. "Маўляў, заключыце адпаведныя дамовы, як таго вымагае пункт 3 рашэньня № 881, і тады акцыю мы вам дазволім", - раз-пораз паўтараюць чыноўнікі. Тое ж, што выканаць умовы, накінутыя заяўнікам масавых мерапрыемстваў рашэньнем гарвыканкаму, практычна немагчыма - адпаведныя службы зазвычай ухіляюцца ад заключэньня неабходных дамоваў, - гэта прадстаўнікоў уладаў зусім не хвалюе.

Гэтым разам усё адбылося паводле звыклага сцэнару. Дамоваў заключыць не ўдалося. Напрыклад, генэральны дырэктар УКВП "Віцебская жыльлёва-камунальная гаспадарка" *Аляксандар Кушароў* ня выслаў, як яго пісьмова прасілі, праект дамовы зь яго прадпрыемствам, а параіў зьвярнуцца ў іншыя арганізацыі, якія займаюцца прыборкай тэрыторыі. У выніку чарговае масавае мерапрыемства забаронена. З пункту гледжаньня чыноўнікаў, усё правільна: яны ж дзейнічаюць нібыта кіруючыся законам, і хіба ім ёсьць справа да таго, што арганізатары меркаванай акцыі ня выканалі патрабаваньне рашэньня гарадзкіх уладаў не з уласнай волі, а таму што тыя, з кім трэба мець дамовы, адмовіліся іх заключаць...

Рашэньне аб забароне пікету 4 жніўня яго арганізатары маюць намер абскардзіць у судовым парадку. Яны ўпэўненыя, што калі б у краіне суды былі незалежныя ад выканаўчай улады, справу яны выйгралі б. Аднак улічваючы беларускую рэчаіснасьць, зразумела, што шанцаў нешта давесьці судзьдзям, якія ня маюць звычкі ў гэткіх справах прыслухоўвацца да голасу праўды і справядлівасьці, амаль няма.

Вырак Алене Семенчуковай — 10 сутак арышту



5 ліпеня у судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску працягнуўся разгляд справы актывісткі "Эўрапейскай Беларусі" Алены Семенчуковай. Судзьдзя Іна Грабоўская прызнала дзяўчыну вінаватай ў парушэньні артыкулу 23.34 КаАП (парушэньне арганізацыі або правядзеньня масавага мерапрыемства) і пакарала яе 10-дзённым адміністрацыйным арыштам. Алена Семенчукова заявіла, што вырак судзьдзі лічыць несправядлівым і зьбіраецца абскардзіць яго.

Такому лютаму пакараньню судзьдзя Грабоўская падвергнула актывістку за распаўсюд улётак з заклікам байкатаваць маючыя адбыцца парлямэнцкія выбары. На думку судзьдзі, рух дзяўчыны па ходніках з раздачай друкаваных матэрыялаў - гэта ня што іншае як пікет, на правядзеньне якога трэба было атрымаць адмысловы дазвол ад уладаў.

Аргумэнт Алены Семенчуковай, агучаны ў залі суду, што пікетаваньне, згодна з законам аб масавых мерапрыемствах, - гэта мерапрыемства, якое не суправаджаецца шэсьцем (а, раздаючы ўлёткі, яна менавіта ішла, а не стаяла на месцы), судзьдзя пакінула без увагі. Таксама як пакінула без увагі і заяву актывісткі пра тое, што ейны ўчынак не падпадае ні пад адно з азначэньняў масавых мерапрыемстваў у вышэй названым законе, таму караць за парушэньне гэтага закону яе нельга.

Сьведкамі на паседжаньні выступалі выключна супрацоўнікі міліцыі. Алена Семенчукова прасіла дапусьціць да ўдзелу ў працэсе ў якасьці сьведкі ейнага брата Сяргея. Аднак судзьдзя адхіліла гэтае хадайніцтва на той падставе, што Сяргею яшчэ ня споўнілася 18-ці гадоў, таму, маўляў, для яго ўдзелу ў судзе неабходная прысутнасьць пэдагога-псыхоляга. Адкласьці судовы разбор, каб выклікаць у суд псыхоляга, судзьдзя палічыла немэтазгодным. Пры гэтым яна зачытала паказаньні Сяргея, дадзеныя ім у міліцэйскім пастарунку - маладзёна там дапытвалі без якіх-кольвек пэдагогаў.

Акруговыя выбарчыя камісіі Віцебшчыны адмовіліся рэгістраваць ініцыятыўныя групы за вылучэньне Статкевіча кандыдатам у дэпутаты

У рэгістрацыі ініцыятыўных груп за вылучэньне **Мікалая Статкевіча** адмовілі ўсе 14 акруговых камісіяў Віцебшчыны, у якія падаваліся адпаведныя дакумэнты. Паводле **Аляксея Гаўруцікава**, віцебскага аднапартыйца палітвязьня, мэтай падачы дакумэнтаў было прыцягненьне ўвагі грамадзкасьці да таго, што ў беларускіх турмах людзей утрымліваюць за апазыцыйныя погляды. Сам спадар **Гаўруцікаў** вырашыў балятавацца ў Віцебскай-Чкалаўскай акрузе № 18. Яго ініцыятыўную групу акруговая выбарчая камісія зарэгістравала 19 ліпеня.

Камісія Віцебскай Кастрычніцкай акругі № 20 першай адмовілася рэгістраваць ініцыятыўную групу па зборы подпісаў за вылучэньне **Мікалая Статкевіча**. Назіральнік **Анатоль Родзік**, сябар партыі левых "Справядлівы сьвет", прысутнічаў на паседжаньні камісіі: "Не зарэгістравалі групу **Статкевіча**, назваўшы цэлы шэраг парушэньняў. Па-першае, няправільна афармленая даверанасьць ад імя **Статкевіча**. Па-другое, ён знаходзіцца ў турме № 4 гораду Магілёва, пра гэта ёсьць даведка. А паводле Выбарчага кодэксу, у выбарах ня маюць права ўдзельнічаць асуджаныя і зьняволеныя, якія адбываюць тэрмін пакараньня. Урэшце, у заяве на рэгістрацыю ініцыятыўнай групы было пазначана, што яе арганізуюць для ўдзелу ў выбарах у Палату прадстаўнікоў 4-га скліканьня, а насамрэч — 5-га".



На фота: *Аляксей Гаўруцікаў*

"Нумар скліканьня тут ні на што не ўплывае. Гэта сьмешна! І мы ўсе гэта разумеем. Увогуле дакумэнты мусіць падаваць патэнцыйны ўдзельнік выбараў, але ж **Мікалай Статкевіч** ня можа гэтага зрабіць! Людзі, вартыя таго, каб быць абранымі ў парлямэнт, у нас сядзяць у турмах. І мы хочам прыцягнуць увагу да гэтай праблемы. Таму падаем заявы на рэгістрацыю ва ўсе 14 камісіяў Віцебшчыны", - сказаў **Аляксей Гаўруцікаў**, сябра і аднапартыец **Мікалая Статкевіча**.

Сяргея Каваленку прымусілі напісаць прашэньне аб памілаваньні

Паводле слоў Алены Каваленкі, пры канцы чэрвеня **віцебскі апазыцыянэр Сяргей Каваленка пад ціскам адміністрацыі папраўчай калёніі напісаў прашэньне аб памілаваньні на імя Аляксандра Лукашэнкі**. Яна пабывала на спатканьні з мужам у магілёўскай калёніі № 19 і распавяла журналістам, як зьявілася на сьвет гэтая папера: "Ён 24 або 25 чэрвеня напісаў. Яму абяцалі, што да 3 ліпеня будзе са сваёй сям'ёй. Ён напісаў на імя прэзыдэнта паўтары радкі: 'Прашу вас мяне памілаваць'", - паведаміла жонка палітвязьня.



Паводле яе слоў, **найбольш моцны ціск на Сяргея аказваўся з боку адміністрацыі калёніі, калі ён знаходзіўся ў карцэры за чарговае парушэньне рэжыму**: "Там былі вельмі дрэнныя ўмовы: дах цёк, шыба была пабітая, і калі быў дождж, то зацякала вада. За ноч трэба было 5-6 разоў уставаць рабіць фізычныя практыкаваньні, каб ня зьмерзнуць. Менавіта ў гэты час да яго прыходзілі па некалькі разоў на дзень і патрабавалі, каб ён напісаў пакаяньне, што ён зьдзейсьніў хуліганскі ўчынак, а не палітычную акцыю, як гэта было насамрэч", - распавяла Алена Каваленка.

Паводле яе слоў, муж распавёў, што прыблізна праз восем дзён знаходжаньня ў карцэры да яго прыйшоў начальнік калёніі: "Ціснуў менавіта сынам, што вось, маўляў, сын безь цябе расьце. Таксама казаў, што з-за таго, што Сяргей ня піша прашэньне, працаўнікам калёніі не дадуць дабаўкі да заработнай платы і ня хопіць іхным дзецям на цукеркі. Потым прыйшлі, сказалі, што ня трэба ніякага пакаяньня, а проста напісаць: прашу мяне памілаваць без раскаяньня, без прызнаньня сваёй віны", - сказала жонка палітвязьня. Пры гэтым, паведаміла яна, муж успамінаў словы Зянона Пазьняка пра тое, што ня трэба гуляць у гульні з катамі.


"**Ён вельмі хоча быць са сваёй сям'ёй, займацца выхаваньнем сына**. Ён бачыць, што час ідзе, а сын расьце безь яго", - сказала Алена, адзначыўшы, што падчас спатканьня сын быў вельмі рады бачыць бацьку, а дачка яго не пазнала. Калі Сяргей Каваленка ўсё ж такі выйдзе зь месцаў зьняволеньня, Алена ня ведае. "У яго 6 парушэньняў за гэты час. Яны рабілі ўсё, каб ён не патрапіў пад амністыю з-за статусу злоснага парушальніка", - адзначыла яна. Тым ня менш жонка Каваленкі спадзяецца на хуткую сустрэчу з мужам: "Ён патрэбен нам на волі. Я думаю, ня толькі нам, але і грамадзтву". Паводле яе слоў, **Сяргей ад сваіх перакананьняў не адмаўляецца і аб сваіх учынках не шкадуе.**

Таксама яна паведаміла, што **ў Сяргея Каваленкі "шмат праблем са здароўем"**. "Ён мне прызнаўся, што моцна падарваў сабе здароўе галадоўкай, і наступствы, напэўна, будуць усё жыцьцё. Вагу ён амаль аднавіў, але абсьледаваньня там няма, і шмат якія вынікі ад яго ўтойваюцца", - распавяла Алена Каваленка. Яна адзначыла, што адміністрацыя не дазволіла перадаць Сяргею лекі.

"Адносіны з боку іншых асуджаных неблагія. **Але вельмі прадузята да яго ставіцца начальнік атраду № 5**. Я сама бачыла ў заяве, што **менавіта ён хадайнічаў, каб Сяргею не дазволілі вынесьці са спатканьня перадачу**", - распавяла жонка палітвязьня. Наступнае спатканьне з палітвязьнем можа быць праз 3 месяцы.

Паўлу Севярынцу афіцыйна паведамілі, што ён не падпадае пад амністыю

26 ліпеня ў дзяжурную частку спэцкамэндатуры № 7 выклікалі сустаршыню "Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі" Паўла Севярынца, які адбывае там тры гады абмежаваньня волі, для азнаямленьня з паперай, у якой паведамляецца, што амністыя да яго не ўжываецца. Падставай для гэтага ёсьць параграф 9 Закону аб амністыі. **"Палітвязьні сёньня – гэта закладнікі, –** кажа Павал Севярынец. **– Відавочна, што выгандляваць грошы за вызваленьне сваіх апанэнтаў на Захадзе рэжыму не ўдалося. Гэта значыць, палітвязьні і надалей застануцца ў турмах"**.



Бюлетэнь "За правы чалавека" выдаецца праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
Наклад 299 асобнікаў.
Пры падрыхтоўцы бюлетэня выкарыстоўваліся матэрыялы сайта http://prava.vitebsk.cc і іншыя Інтэрнэт-рэсурсы.